# Уступ

Гэты збор быў задуманы і збольшага ўкладзены вядомым беларускім філолагам, доктарам навук Арсенем Лісам (1934–2018). Праца над ім заняла шмат гадоў, і, на жаль, яму ўжо не дадзена было пабачыць яе вынік.

Постаць Аляксандра Цвікевіча зацікавіла яго не выпадкова. Цвікевіч – адзін з найбольш выдатных беларускіх дзеячаў, якія прысвяцілі жыццё барацьбе за незалежнасць Бацькаўшчыны. Стаяў ля вытокаў дыпламатыі Беларускай Народнай Рэспублікі, у эміграцыі ўзначаліў яе Міністэрства замежных спраў, стаўшы затым кіраўніком урада. Пасля вяртання ў БССР як вучоны сакратар Інбелкульта актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі і станаўленні беларускай навукі. У гэты перыяд, у другой палове 20-х, нягледзячы на мізэрна кароткі час, адведзены, як высветлілася, беларускім навукоўцам, паспеў стаць адным з найбольш адметных айчынных гісторыкаў.

Неабходнасць выдання збору твораў Аляксандра Цвікевіча, як і іншых дзеячаў таго перыяду, – актуальная задача для навукі сённяшняй. Паколькі было вырашана ўключыць у збор не толькі апублікаваныя творы, але і пашырыць яго за кошт архіўных дакументаў, выданне падзелена на два тамы. У першы том увайшлі гістарычныя і гісторыка-публіцыстычныя працы Аляксандра Цвікевіча. У другі плануецца ўключыць шматлікую публіцыстыку, якая датычыла бягучых праблем палітычнага і культурнага жыцця і друкавалася ў розных беларускіх выданнях – як у самой Беларусі, так і ў суседніх краінах. Асобна стаяць яго публікацыі па прапагандзе медыцынскіх ведаў, якія друкаваліся ў БССР. Таксама ў другі том павінны ўвайсці архіўныя матэрыялы: перапіска Цвікевіча, дыпламатычныя матэрыялы, тэксты выступленняў і інш.

Першы том складаецца з трох прац манаграфічнага плана, дзвюх брашур, чатырох артыкулаў і адной лекцыі.

Першай грунтоўнай працай Цвікевіча, якая выйшла асобнай кнігай, была «Адраджэнне Беларусі і Польшча» (Берлін, 1921), прысвечаная гісторыі беларуска-польскіх адносін. Праца ўтрымлівае навукова-даведачны апарат, хаця і мае заўважны публі-

цыстычны ўхіл. Выданне мела і практычныя мэты – гісторыя ўзаемаадносін з заходняй суседкай выступае як свайго роду навуковая даведка да федэратыўных планаў, якія ў той час актыўна абмяркоўваліся. Не адкідаючы такога варыянта ў прынцыпе, аўтар паставіўся скептычна адносна магчымасці яго рэалізацыі ў тагачасных умовах, з улікам праведзенага ім аналізу, як змяняліся погляды польскіх эліт на «ўсходняе пытанне» на працягу гісторыі, і тагачасных іх пазіцый.

Калі «Адраджэнне Беларусі і Польшча» – гэта досвед узаемаадносін з заходнім суседам, то «Заходнерусізм» (Менск, 1929) – самая знакавая і знакамітая праца Цвікевіча – прысвечана некаторым найбольш істотным аспектам у дачыненнях з усходнім. Дакладней, спецыфічнай плыні ў расійскай грамадска-палітычнай думцы другой паловы XIX – пачатку XX ст., якая атрымала назву, вынесеную ў загаловак кнігі. Звычайна яна выступае і разглядаецца таксама як напрамак у гістарыяграфіі. Асобныя яе прыкметы можна было разгледзець і раней за сярэдзіну XIX ст., але як адпаведны напрамак заходнерусізм склаўся менавіта ў гэты перыяд. З працы Цвікевіча выразна вынікае, што пачыналася ўсё як крайне правая публіцыстыка пад крылом генерал-губернатара Міхаіла Мураўёва («Вестник» Ксенафонта Гаворскага), якая адны народы паказвала як «сапсаваныя», а іншым адмаўляла ў існаванні. У наступным, праз працы Міхаіла Каяловіча (якія ў рэцэнзіях сучаснікі, здаралася, таксама акрэслівалі часам як «спрэчныя публіцыстычныя практыкаванні») і яго наступнікаў, заходнерусізм шырока пранікае ў расійскую гуманітарную навуку і грамадскую думку. Падобная ідэалогія, якая адмаўляла існаванне беларускага і ўкраінскага народаў, моцна паўплывала на расійскае грамадства і, на жаль, не сышла з гістарычнай арэны са знікненнем царызму.

Па гэтай прычыне праца Цвікевіча не згубіла актуальнасці і сёння. Друкавалася яна чатыры разы. Спачатку, у 1928–1929 гг., – па частках у «Полымі» пад назвай «“Западнорусская” школа і яе прадстаўнікі», затым у 1929 г. выйшла асобнай кнігай. Чытаючы яе, бачыш, што аўтар практычна не займаўся самацэнзурай і пісаў тое, што думаў. Кніга была вельмі смелая для савецкіх часоў. Арышт аўтара ў наступным годзе прывёў да канфіскацыі і амаль поўнага знішчэння яе трохтысячнага накладу. Захаваліся толькі адзінкавыя асобнікі. Адзін з іх

належаў Антону Адамовічу, які падараваў яго Уладзіміру Сядуру, а ў 1982 г. паводле яго праца была перавыдадзена ў нямецкім Ляйдэне і стала больш шырока вядомай на эміграцыі[1]. Іншы асобнік належаў Уладзіміру Пічэту, ад якога трапіў да Мікалая Улашчыка, а затым перайшоў у кнігазбор Міколы Купавы. Паводле яго ў 1993 г. перавыданне было ажыццёўлена ў незалежнай Беларусі[2].

У 20-я гады кніга выйшла з мінімальнай рэдактурай і ўтрымлівала шмат недакладнасцей. Аўтар нібы спяшаўся (а магчыма, і сапраўды спяшаўся). Перавыданні выходзілі з захаваннем асаблівасцей папярэдняга, у тым ліку блытанай пунктуацыі. У дадзеным выданні (гэта датычыць і іншых прац Цвікевіча) усе недакладнасці па магчымасці папраўлены (афармленне і спасылкі) ці адзначаны – суправаджаюцца адпаведнымі заўвагамі. Цытаты спраўджаны паводле арыгінала, але даюцца з захаваннем асаблівасцей аўтарскага перакладу.

Кніга пра заходнерусізм (як у значнай ступені і папярэдняя, «Адраджэнне Беларусі і Польшча») актуальная не толькі паводле тэматыкі, але і абранага Цвікевічам напрамку даследаванняў. Па сутнасці, гэта ранні прыклад інтэлектуальнай гісторыі або таго, што сёння ў шырокім сэнсе разумеецца як гісторыя ідэй. Калі ж казаць пра тэматыку, то яна не вычэрпваецца адным заходнерусізмам. Аўтар фармулюе шэраг праблем, якія і сёння з пэўных прычын унікаюцца гісторыкамі. Так, пераходзячы да палітыкі царызму ў разгляданы час, Цвікевіч характарызуе яе як каланіялізм, а тагачасную Беларусь разглядае як расійскую калонію. Выснова ім робіцца на падставе аналізу розных абмежаванняў, якія дзейнічалі ў той час на Беларусі, непаўнапраўнага становішча яе насельніцтва.

Трэцяя з уключаных у першы том найбольш значных прац Цвікевіча – «Інбелкульт беларускае культуры» (Менск, 1926) – першы і таксама па сённяшні дзень актуальны нарыс першых чатырох гадоў дзейнасці ўстановы, напісаны яе вучоным сакратаром. У ім сістэматызавана вялікая колькасць інфармацыі пра дзейнасць інстытута па розных напрамках, звесткі пра яго су-

[1] Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе: асобныя выданьні / Склад. З. Кіпель і В. Кіпель. Нью-Ёрк–Менск, 2003. С. 394–395.

[2] Цвікевіч А. «Западноруссизм»: нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Менск, 1993. С. 4.

працоўнікаў. Праца праілюстравана здымкамі аддзелаў і секцый. Размова ў ёй ідзе фактычна пра пачаткі беларускай навукі – як арганізаванай, інстытуцыялізаванай сферы дзейнасці. Гэта датычыць як гуманітарных дысцыплін, так і прыродазнаўчых.

Брашуры і артыкулы, якія публікуюцца ў першым томе, маюць хутчэй гісторыка-публіцыстычны характар. Пад нацыянальна-вызваленчы рух Цвікевіч імкнуўся падвесці навуковую аснову і папулярызаваць яго ў інтэлектуальным асяроддзі за межамі краіны.

Палітычная публіцыстыка Цвікевіча выразна дзеліцца на два этапы: незалежніцкі (у тым ліку эміграцыйная) і савецкі. У савецкі перыяд, пад уражаннем поспехаў дзяржаўна-культурнага будаўніцтва ў БССР, Цвікевіч крытыкаваў сваіх былых паплечнікаў па барацьбе за незалежнасць, якія засталіся за мяжой, нават пасмейваўся з іх недаверу, але сам у выніку жорстка паплаціўся за сваё рашэнне вярнуцца. У 1930 г., адным з першых, ён быў арыштаваны, а ў 1937 г. – у шэрагу найлепшых прадстаўнікоў навуковай, культурнай і палітычнай эліты краіны – расстраляны.

Публіцыстыка і творчасць у цэлым Аляксандра Цвікевіча падрабязна ахарактарызаваны ў прадмове аўтарства Арсеня Ліса. Біяграфію дзеяча напісаў кандыдат гістарычных навук Аляксандр Горны.

Пры падрыхтоўцы тэкстаў да друку захоўваўся максімальна ашчадны падыход: усе яны пададзены сучасным правапісам, але з захаваннем аўтарскіх і шэрагу тагачасных моўных асаблівасцей.

З сённяшняй перспектывы Аляксандр Цвікевіч у гісторыі беларускай дзяржаўнасці і навукі XX ст. стаіць у шэрагу пачынальнікаў, кожны з якіх заслугоўвае на асобны збор твораў.

*Дзмітрый Віцько*